


Склаў Юрый ФАЛІНСКІ, г. Мінск.

## Праверце, калі ласка, адказы

**Па гарызанталі:** Арбітраж. Заказ. Апал. Ордар. Ганьба. Трак. Ежа. Антон. Ода. Іма. Рэтра. Крокус. Вата. Пірат. Нанду. Тара. Самакат. Статак. Рака.

**Па вертыкалі:** Азарт. Брага. Рысь. Жара. Зло. Код. Лакатар. Рэжым. Брод. Торт. Нара. Ірак. Ярмо. Экватар. Ранет. Канат. Спуск. Атака. Агата. Рак.

## Ну і ну!

### НА ЗЛАМЫСНІКА ВЫВЕЎ «МІКІ МАЎС»

**Супрацоўнікамі аддзела крымінальнага вышуку Цэнтральнага РУУС сталіцы затрыманы 21-гадовы мінчанін, які падазраецца ў крадзяжы рэчаў у сталічным парку. Устанавіць яго дапамагла прыкмета — татуіроўка ў выглядзе «Мікі Маўса».**

— У міліцыю звярнуліся дзве дзяўчыны і хлопец, якія расказалі, што адпачывалі ў парку, дзе пазнаёміліся з трыма маладымі людзьмі. Пасля нядоўгачасовых стасункаў хлопец з дзяўчатамі сышлі купацца, пакінуўшы свае рэчы на лаўцы і папрасіўшы прыглядзець за імі сваіх новых знаёмых. Калі кампанія вярнулася, то не знайшлі маладых людзей, а таксама сумкі, якая належала адной з дзяўчат, — расказала **прэс-афіцэр Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна АБОЗНАЯ**.

Падчас аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў высветлілася: адна з заяўніц запомніла, што ў аднаго з маладых людзей на целе была татуіроўка «Мікі Маўс». Неўзабаве міліцыянеры ўстанавілі асобу маладога чалавека з апісанай прыкметай. Аказалася, што да здзяйснення крадзяжу датычны яго сябар: пасля таго, як кампанія сышла купацца, тры хлопцы вырашылі сысці, а адзін з іх, адстаўшы ад астатніх, забраў з сабой сумку, дастаў з яе кашалёк і іншыя каштоўныя рэчы, пасля чаго выкінуў сумку.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.32 | 20.57 | 15.25 |
| Віцебск — | 5.17 | 20.52 | 15.35 |
| Магілёў — | 5.22 | 20.47 | 15.25 |
| Гомель — | 5.25 | 20.38 | 15.13 |
| Гродна — | 5.49 | 21.12 | 15.23 |
| Брэст — | 5.55 | 21.06 | 15.11 |

## Месяц

*Маладзік 02.08—09.08. Месяц у сузор'і Шаляў.*

## Імяніны

*Пр.* Хрысціны, Барысы, Георгія, Глеба, Мікалая, Рамана.
*К.* Славаміра, Сціпана, Якуба.



Фота Івана КУПАРВАСА.

# ЗАЎТРА




## ...у суседзяў

ВАРШАВА +19..+21°C
ВІЛЬНЮС +17..+19°C
КІЕЎ +25..+27°C
МАСКВА +30..+32°C
РЫГА +18..+20°C
С.-ПЕЦЯРБУРГ +18..+20°C

## Даты | Падзеі | Людзі

### 6 ЖНІЎНЯ

**1517** год — беларускі асветнік, вучоны і кнігадрукар Францыск Скарына выдаў у Празе (Чэхія) першую кнігу Біблії на старажытнай беларускай мове — «Псалтыр» («Песни царя Давида еже словуть Псалтырь», 358 лістоў). Гэтая дата лічыцца пачаткам беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання. На сённяшні дзень захаваліся толькі два экземпляры скарынаўскага «Псалтыра». Адзін з іх з 1527 года з'яўляецца ўласнасцю Герліцкай бібліятэкі Верхнялужыцкага навуковага таварыства ў Германіі (была знойдзена ў Герліцы). «Псалтыр» уваходзіць у склад Старога запавету («Пісання») і ўключае 150 так званых Давідавых псалмоў — твораў іудзейскай і хрысціянскай лірыкі. У прадмове да выдання Скарына ацэньвае яго як «детем малым початок всякое доброе науки, дорослым помножение в науце, мужем моцное утвержение».

**1896** год — 120 гадоў таму нарадзіўся Уладзімір Рыгоравіч Ванееў, партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР, адзін з арганізатараў падполля і партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Брыгадны камісар. Удзельнік Грамадзянскай вайны. З 1937 года — старшыня выканкама Мінскага гарсавета, з 1938-га — наркам гандлю БССР, з 1939 года — намеснік старшыні СНК БССР. У Вялікую Айчынную вайну (з ліпеня 1941 г. — член ваеннага савета 19-й арміі Заходняга фронту) удзельнічаў у абароне Віцебска, Смаленска, Масквы, як сакратар ЦК КП (б) Б арганізоўваў эвакуацыю ў савецкі тыл насельніцтва і прамысловых прадпрыемстваў БССР, прымаў удзел у арганізацыі падполля, мабілізацыі сіл для разгортвання партызанскай барацьбы на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Загінуў у баі ў 1941 годзе.

**1926** год — 90 гадоў таму нарадзіўся (вёска Растоў Акцябрскага раёна) Леанід Ніканоравіч Дробаў, беларускі мастацтвазнаўца і жывапісец, доктар мастацтвазнаўства, прафесар. Працаваў у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. Аўтар кніг па гісторыі беларускага жывапісу, манаграфій пра беларускіх мастакоў, сюжэтна-тэматычных работ «Партызанская кухня», «Прэлюдыя»; пейзажаў, партрэтаў і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1996). Памёр у 2002 годзе.



**1936** год — 80 гадоў таму нарадзіўся (в. Першамайская, цяпер у Бярозаўскім раёне) Пётр Аляксандравіч Віцязь, беларускі вучоны ў галіне распрацоўкі новых матэрыялаў, тэхналогій і машынабудавання, акадэмік НАН Беларусі, доктар тэхнічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Аўтар больш за 700 навуковых прац у галіне распрацоўкі тэарэтычных і практычных асноў стварэння порыстых, канструкцыйных і антыфрыкцыйных парашковых матэрыялаў і вырабаў з зададзенымі ўласцівасцямі на аснове металічных, керамічных парашкоў і неарганічных валокнаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прэміі Савета Міністраў СССР, прэміі НАН Беларусі і Сібірскага аддзялення РАН імя акадэміка В.А. Капцюга. Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

**1941** год — Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена беларускім партызанам Ціхану Бумажкову і Фёдару Паўлоўскаму — першым з партызанаў Вялікай Айчыннай вайны.

### Было сказана

**Янка КУПАЛА, народны паэт Беларусі:**
*«Песня мая не шукае чырвонцаў».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Найлепшы сябар жанчын у прыгожых туфлях — лейкапластыр.**

— Як справы?
— Учора ўрачыста набыў паўаўтаматычны ідэнтыфікатар-размеркавальнік шкарпэтак па парах.
— Што?!
— Што-што... Ажаніўся.

**У цябе ўвечары футбол і ты б хацеў спакойна правесці вечар на канапе перад тэлевізарам пад бутэлечку піва? Няма праблем! Купі жонцы дарагую спадніцу ў буцік, і яна цэлы вечар будзе занятая каля люстэрка!**

— Спадарыня, якая на вас прыгожая сукенка, каб я так жыў!
— Дык я і сама не горшая, нават яшчэ дужа выдатная!..
— Дык што ж мы чакаем? Здымайце, паглядзім!




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3048.
Нумар падпісаны ў 19.30 5 жніўня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12